■ Людзі і лёсы

# ЗМАГАЛІСЯ ЗА СЫНА І ПЕРАМАГЛІ

## Як хлопец з ДЦП атрымаў залаты медаль

**Леў Канстанцінавіч і яго жонка Глафіра Канстанцінаўна са Слоніма, ніяк не чакалі вялікага няшчасця, якое спасцігла іх маладую сям'ю: першынец на гэты свет з'явіўся калекам. Маладыя людзі вялі здаровы лад жыцця. Ды ў вялікай радні Кіргетаў не было ніякіх надзвычайных здарэнняў. А дактары паставілі іх немаўляці Міхасю страшны дыягназ — дзіцячы цэрабральны параліч.**

«За што такое пакаранне?» – не магла супакоіцца Глафіра Канстанцінаўна. Але ж Леў Канстанцінавіч, па натуры аптыміст, супакойваў жонку: «Цяпер галоўнае для нас — не апускаць рук. Дарогі назад нам няма. Застаецца адно: змагацца разам за сына». Толькі пытанне: як? Глафіра — інжынер-тэхнолаг — вымушана была пакінуць працу на кардонна-папяровым заводзе і займацца дамашнімі справамі. Дзіця ж неабходна рэгулярна прагульваць у калясцы.

**Ён ведае прозвішчы і біяграфіі ўсіх вядомых спартсменаў нашай краіны і свету. Маці кажа, каб не хвароба, яе сын меў бы вялікія спартыўныя дасягненні альбо стаў вядомым трэнерам.**

Балазе, што за хатай Кіргетаў пачынаецца лес. І падчас прагулак маці пачала заўважаць, як яе Міхасёк цягнецца да кожнага грыбка ды кветачкі, прыслухоўваецца да спеву птушак. Значыць, сын разумее прыгажосць у прыродзе. У душы маці нарадзілася надзея на штосьці лепшае.

Школу хлопчык наведваць не мог. Але ж педагогі мясцовай адзінаццацігодкі прапанавалі надомнае навучанне.

Першай настаўніцай хлапчука была Соф'я Пятроўна Янушка. Яна навучыла малога пісаць і чытаць. Вядома ж, гэта давалася дзіцяці нялёгка. Ён з цяжкасцю вымаўляў кожнае слова. Настаўніца часта казала Глафіры Канстанцінаўне, што яна заўважае, з якой настойлівасцю і ўпартасцю, быццам кволая раслінка да сонейка, Міхасёк цягнецца да ведаў. Вялікаму яго жаданню вучыцца можна было толькі пазайздросціць. Таму Пятроўна з задавальненнем наведвалася да Кіргетаў. Ёй прыемна было бачыць вынікі сваіх намаганняў.


Міхась побач з маці.

Выкладчыцу рускай мовы і літаратуры Веру Антонаўну Чэрнік таксама зацікавілі здольнасці Міхася, які вершаваныя радкі лёгка і запамінаў на ляту. Забягаючы крыху ўперад, адзначым, што цяпер у Кіргетаў ёсць багатая бібліятэка, дзе няма ніводнай кніжкі, не прачытанай Міхасём. Ён ведае прозвішчы і біяграфіі ўсіх вядомых спартсменаў нашай краіны і свету. Маці кажа, каб не хвароба, яе сын меў бы вялікія спартыўныя дасягненні альбо стаў вядомым трэнерам. Настаўніца матэматыкі Побат Ніна Паўлаўна таксама радавалася поспехам гэтага сціплага юнака, які паспяхова асвойваў дакладныя навукі. Такой жа думкі прытрымліваліся і тры выкладчыкі дакладных прадметаў з педагагічнай сям'і Сідаровічаў. Выпускнік сярэдняй школы быў не па ўзросце эрудзіраваным. Ён хутка (без дапаможнікаў) разгадваў рэбусы і крыжаванкі, разважаў (як дарослы чалавек) пра падзеі ў нашай краіне і ў свеце.

— Пасля педсавета па выніках экзаменаў за курс сярэдняй школы педагогі аднагалосна прынялі пастанову: узнагародзіць Кіргета Міхаіла Львовіча залатым медалём, — кажа былы дырэктар Альберцінскай сярэдняй школы Надзея Андрэеўна Сяркевіч.

Але ж па існуючым тады заканадаўстве такая ўзнагарода вучням-надомнікам выдавалася толькі ў выключных выпадках — з дазволу Міністэрства адукацыі. І дырэктар паехала ў Мінск.

— Дарэмныя клопаты вашы, Андрэеўна, — казалі ў Слонімскім аддзеле адукацыі.

— Мабыць, не трэба займацца гэтай марнай справай, — раілі мясцовыя скептыкі.

Але ж Надзея Андрэеўна не губляла надзеі. Яна прыхапіла ў Мінск водгукі ўсіх настаўнікаў пра вучня. І, што вы думаеце, вярнулася з дазволам на атрыманне залатога медаля для юнака.

**«За што такое пакаранне?» – не магла супакоіцца Глафіра Канстанцінаўна. Але ж Леў Канстанцінавіч, па натуры аптыміст, супакойваў жонку: «Цяпер галоўнае для нас — не апускаць рук.**

— Каб вы ведалі, якой радасцю свяціліся вочы Міхася, калі яму ўручаўся медаль, — узгадвае Надзея Андрэеўна. — Ён засведчыў, што гэта ўзнагарода ўсёй іх сям'і і настаўнікаў. Бо, калі б не яны, ён так і застаўся б звычайным інвалідам.

Тады Міхась зазначыў, што яго жыццё набыло сэнс. І ён мае намер не спыняцца на дасягнутым, а працягваць вучобу. Тым болей што Надзея Андрэеўна з Мінска прывезла спіс навучальных устаноў. Хлопец выбраў для сябе завочнае аддзяленне Навагрудскага гандлёва-эканамічнага тэхнікума. Бо тэхнікум знаходзіцца бліжэй да дома. Здаваць сесіі ён ездзіў разам з маці. Дырэкцыя навучальнай установы загадзя клапацілася, каб іх пасялілі ў інтэрнаце для навучэнцаў. У выніку хлопец паспяхова скончыў тэхнікум, атрымаў дыплом.

Нядаўна Міхасю Кіргету споўнілася сорак. Яго шчыра віншавалі шматлікія сябры па сацыяльных сетках. А адна дзяўчына, з роднага Слоніма, часта прыходзіць да яго ў госці. Яна мае вялікае жаданне часцей сустракацца з цікавым і эрудзіраваным чалавекам. Дарэчы, Міхась нядаўна прачытаў гістарычны раман «Крыжакі» на польскай мове. Ён марыць свабодна размаўляць з гасцямі, якія прыязджаюць з суседняй дзяржавы. Таму яго бібліятэка папоўнілася творамі Генрыка Сянкевіча. Напярэдзе яшчэ англійская, нямецкая і іншыя мовы, якімі хлопец жадае авалодаць самастойна. Адным словам, будуць яшчэ новыя перамогі. Бо кожны дзень Кіргета-малодшага сплянаваны так шчыльна, што няма ніводнай свабоднай хвілінкі. Кажуць, што ён пайшоў у свайго няўрымслівага дзеда, былога дырэктара школы.

...У кватэры Кіргетаў шмат хатніх кветак. Глафіра Канстанцінаўна кажа, што яны сімвалізуюць квітнеючае жыццё сына. А Міхась мае намер стварыць свой сайт, на якім будзе дзяліцца сваім вопытам з людзьмі, якія трапілі ў такое ж складанае становішча.

**Канстанцін СТАНКЕВІЧ** ■

■ Вазьму твой боль...




# РАТАВАЦЬ БЛІЗКІХ... НЕМАГЧЫМА

Я часта чую ад матуль падапечных анкахворых дзетак скаргі на тое, што ў цяжкую хвіліну іх больш падтрымліваюць незнаёмыя людзі, чым блізкія. Нядаўна мама Аліна нават расплакалася ў тэлефонную трубку — так дзякавала, што не пакідаем яе, малазнаёмую жанчыну, у той час як сваякі адвярнуліся.

Яна думае, што адна такая, што праблема ў родных, іх ненадзейнасці абыякавасці. А можа, у ёй самой? Што зрабіла не так, чым заслужыла пагарду? Жанчына не знаходзіць сабе месца і ратуецца толькі падтрымкай чужых валанцёраў, матэрыяльнай і маральнай.

Але я бачыла шмат такіх выпадкаў. Гэта заканамернасць, абсалютна характэрная для чалавечай сутнасці. Сваякі не дрэнныя, а яна не вінаватая. Так працуе інстынкт самазахавання. Блізкім цяжэй дапамагаць, калі ведаеш, што гора вялікае і што далей можа быць горш. Разумееш, што маленькая дзяўчынка, любімая пляменніца, можа згаснуць на тваіх вачах. Падсвядома, інстынктыўна ты хаваешся ад гэтага, аддаляешся, аддзяляеш сябе ад гора, перастаеш прымаць удзел, спадзеючыся выратавацца ад болю.

Чужы чалавек прыходзіць зніадкуль. Ён не бачыў, як нараджалася гэтая маленькая дзяўчынка, не калыхаў яе на сваіх руках, не гушкаў на арэлях, не смяяўся з першых няўмелых крокаў, не чуў першых слоў. Яго нічога з ёй не звязвае. Яму прасцей. Ён паглыбляецца, з самага пачатку рыхтуючыся да дрэннага фіналу. Ён гатовы страціць яе. Бо яна мала што значыць для яго.

Наваколле характарызуе мяне як неверагодна пазітыўнага жыццялюба. А вось майму мужу не пашчасціла — ажаніўся з істэрычкай. Блізкім заўсёды дастаецца ныццё, капрызы, зрывы, агрэсія. Гэта на людзях мы ўсмешлівыя і добразычлівыя. А пару выпускаем дома. Родныя ведаюць нас рознымі, бачылі шмат. І ім цяжка абстрагавацца ад нас непрыязных і непрыглядных. Гэта другая прычына складанасці ратавання блізкіх.

Адна жанчына, цяжка хварэючы, прасіла гатаваць ёй смачную ежу і падаваць у прыгожым посудзе. Яна ўжо не магла хадзіць і не ўставала з ложка. Клопатаў было шмат, і родныя з сіл выбіваліся, даглядаючы яе. Стравы выбіралі, каб хутчэй і прасцей, абед падавалі ў пластыкавай місцы, каб хворая не разбіла, выпусціўшы са слабых рук. Яна капрызіла, адмаўлялася ад такой ежы, не прымала такі догляд. Сваркі, непаразуменне, скандалы.

Збоку гледзячы на сітуацыю, усё разумееш. Чалавек тонкага складу цяжка перажываў сваю немач і залежнасць ад іншых. Хацелася ўзнёсласці, прыгажосці, хацелася расфарбаваць свае дні, якія, яна, відаць, разумела, уже падлічаныя. Хацелася пажыць па-чалавечы.

А блізкія, звар'яцеўшы ад свайго гора, азлобіліся, пачалі кідацца на ўсіх, у тым ліку і на яго прычыну — хворую сваячку. Яны вінавацілі яе ў тым, што захварэла, прычыніўшы столькі болю; у тым, што пакідае іх, так і не даўшы змірыцца і прыняць; у тым, што патрабуе столькі ўвагі; у тым, што забірае сілы; у тым, што памірае. Яны не маглі ў сваёй хранічнай стомленасці і недасыпе праз глыбокія кругі пад вачыма разгледзець простай чалавечай неабходнасці — паміраць годна.

Нам цяжка прыняць нервовыя зрывы хворых сваякоў, цяжка зразумець іх пераасэнсаванне жыцця, цяжка не асудзіць капрызы. Бо нам жа таксама складана. Гэта ж у нас захварэў блізкі чалавек, гэта на нашы плечы кладзецца клопат пра яго. Гэта нам (не дай Бог!) потым перажываць страту. Гэта мы тут бедныя! Мы не ведаем, што гаварыць, як сябе паводзіць. Усё атрымліваецца штучным і ненатуральным. І часта, жадаючы падтрымаць, мы толькі крыўдзім.

Валанцёр — чалавек падрыхтаваны, нават калі гэта валанцёр-навічок. Ён ведае, куды і для чаго прыйшоў. На яго не звальваецца раптоўная неабходнасць клопату. Ён свядома, асэнсавана прыняў гэта. Ён не супрацьпастаўляецца абставінам, а падпарадкоўваецца ім. Ён на адной хвалі з хворым, у іх адно кола інтарэсаў і больш шанцаў знайсці паразуменне. Проста дазвольце блізкім застацца на задворку такой сітуацыі. Не асуджайце іх, не марнуйце часу на тлумачэнні, не прымушайце і не ўскладайце надзеі. Дайце ім магчымасць з усмешкай прэзентаваць вам распісную фарфоравую талерку, ад душы рабіць вам прыемныя дробязі, а не паглыбляцца ў боль і, як загнаны конь, нясцерпна лічыць дні да канца. А вам будзе прасцей ў коле тых, хто ў тэме.

Я, напрыклад, вельмі падтрымліваю ідэю дамоў састарэлых. Не толькі ў ролі сваячкі, але і ў ролі самой састарэлай. Я хачу, каб у пэўным узросце і з пэўнымі праблемамі дзеці адправілі мяне ў спецыялізаваную ўстанову. Не пра дзяцей клапачуся — пра сябе. Там асяродак такіх жа, з такімі ж думкамі і тэмамі. І падрыхтаваны персанал, які выконвае сваю працу, не затрачваючы пры гэтым душэўныя сілы, не становячыся целем, не праклінаючы белы свет, сябе і старое нямоглае цела. Я не хачу, каб апошні час зносін з блізкімі дайшоў да гэтага. А боль, стомленасць абавязкова выклікае агрэсію, сваркі і крыўды. Я хачу, каб яны прыходзілі да мяне ў госці свежымі, шчаслівымі і вясёлымі, каб расказвалі пра свае навіны, каб у іх было сваё жыццё, а не павіннасць, абавязак з духу выбіцца, бо я ж калісьці іх нарадзіла. Я хачу, каб нашы сустрэчы былі раднымі, каб мы былі ўдзячныя адно аднаму і запомнілі толькі светлае. А чорную работу няхай робіць спецыяльна навучаны персанал.

Калі ў нябыт адыходзіла мая цётачка, я не была побач. Неверагодных высілкаў мне каштавалі кароткія сухія званкі ёй. І ў апошні час я проста перастала званіць. Я ратавала чужых мне, незнаёмых людзей з такім жа дыягназам. Я падтрымлівала, шкадавала іх, ахваравала свой час, грошы і эмоцыі. Але нічога не зрабіла для паміраючай цёткі.

Толькі пасля яе адыходу я адчула, якой блізкай яна была мне, як мы маглі сябраваць і разумець адна адну. Я лаўлю сябе на яе думках, чытаю яе ў сабе. І не магу дараваць, што не была побач, што не дала элементарнага — проста прысутнасці, маўклівага разумення, магчымасці выгаварыцца, быць пачутай і зразуметай. Мне вельмі не хапае яе. Праз гады страта не становіцца меншай, боль не сціхае, успаміны не сціраюцца.

Але, цяпер зразумеўшы свае паводзіны, адшукаўшы іх прычыны, баюся, што, нават адматаўшы час назад, я зрабіла б усё тое самае. Блізкіх цяжка ратаваць. Іх ратаваць немагчыма. Яны надта шмат значаць для нас.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА, заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»** ■